## ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ

**Асноўныя паняцці:** фанетыка, фанетычная транскрыпцыя, фраза, маўленчы такт (сінтагма), фанетычнае слова, гук, галосныя і зычныя гукі, фанетычныя (пазіцыйныя і камбінаторныя) змены гукаў, чаргаванні (пазіцыйныя і гістарычныя) гукаў, склад, складападзел, націск, інтанацыя, фаналогія, фанема.

**1. Затранскрыбіруйце тэкст, падзяляючы яго на фразы і маўленчыя такты (сінтагмы). Адкажыце, ад чаго залежыць падзел фразы на маўленчыя такты. Назавіце правілы фанетычнай транскрыпцыі. Адзначце ўсе выпадкі несупадзення арфаграфічнага і фанетычнага запісу.**

Пераскочыўшы каменне, стрымгалоў у садок збегла сцежка. Разарвалася зігзагам пад сівымі, яшчэ не аціяжэлымі ад свайго прыплоду яблынямі. Густы ліповы пах нават прыпыніў Алесю: у Сымонавым садку зморана пагойдвала жоўтым ад шчодрага цвету галлём, не могучы ацерабіцца ад пчол, высокая старая ліпа.

Ужо каля рэчкі гэты густы мядовы пах ліпы перабіў распараны ў ружаватых чачотках гаркавата-млосны валяр'ян. Хмялеючы ад яго, Алеся перайшла кладку.

Чуючы босымі нагамі калючы жвірок, пайшла цвёрдаю сцежкаю каля жыта. Аб твар, аб рукі казыталіся вусатыя, ужо трошкі звіслыя ад налітага зерня каласы. На падсохлай траве, на шурпатых сіва-ліловых вусах зіхацела чырванню, трымалася, мусіць, на дождж раса.

Ад жыта, што пры беразе зарасло злінялаю валошкаю, пахла прэснаю травою.

Пры сцежцы ў рэдзенькай траве хаваліся марныя ліловыя буслікі, і шчымлівая радасць апякала Алесіну памяць – успомнілася нешта далёкае, светла-дзіцячае, як хадзіла за каровамі па калюча шапаткім іржышчы, збіраючы ў букецік гэтыя буслікі.

В. Адамчык.

**2. Затранскрыбіруйце тэкст. З кожнай фразы выпішыце фанетычныя словы. Адкажыце, словамі якіх часцін мовы з'яўляюцца лексічныя адзінкі, што ўваходзяць у склад фанетычных слоў? Чым абумоўлена з'яўленне ў вуснай мове фанетычных слоў?**

Многія схільны падменьваць шчасце звычайнай радасцю. Ці так гэта? Радасць і шчасце як галінка і дрэва. Вядома, дрэва не можа жыць без галінак, і чым болей іх, гэтых галінак, тым прыгажэйшае дрэва. Тое ж і ў чалавеку: чым больш у яго штодзённых, вялікіх і малых радасцей – тым паўней, тым глыбей яго шчасце.

У кожнага сваё дрэва шчасця. А ўся зямля – гэта агромісты сад. І чым больш у ім здаровых, квітнеючых дрэў – тым прыгажэйшая наша зямля.

З. Прыгодзіч.

**3. Прачытайце верш. Ахарактарызуйце ў ім усе галосныя гукі ў моўнай пазіцыі. Якія функцыянальныя і акустычныя асаблівасці адрозніваюць галосныя гукі ад зычных? Выпішыце з тэксту словы з гукам [а], які ўзнік у выніку фанетычнага закона якання.**

Цуд тварыўся – я праспаў:
Снег дасвеццем перапаў
Рана-рана.

І ляжыць ён на дварах,
На парканах, на дрывах –
Чысты-чысты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для гасцей абрус у нас
Сцелюць гэтакі якраз
Белы-белы.

Счараваў вяскоўцаў снег:
Хоць бы слова, крык ды смех, –
Ціха-ціха.

Моўчкі й я стаю ў цішы,
 І так лёгка на душы,
Светла-светла ...

Н. Гілевіч.

**4. Выпішыце словы, у якіх ненаціскныя галосныя [о], [э], [а] не падпалі пад якасную рэдукцыю. Растлумачце чаму. Сфармулюйце законы акання і якання.**

Этыка, рэзюмэ, маўленне, цагляны, Шаўчэнка, радыёголас, дэталь, альма-матар, Одэр, дзясяты, егер, экзотыка, кафэ, філе, экзэмпляр, каласы, брысці, арандаваць, этажэрка, рэвізія, лідар, сястра, герой, завязь, дзесяць, кашляць, сямнаццаць, яфрэйтар, леснікі, Еўропа, кашнэ, камюніке, тунэль, крывавы, экватар, шніцаль, Ландэр, камп’ютар, дзявяты, восем, Бялынічы, кефір, тысяча, кераміка, ерэтык, піке, сервіз, дрывотня, крамлёўскі, мяккаваты, цэнтралізм, адажыа, радыёвежа, каратэ.

**5. Размяркуйце словы і спалучэнні слоў па слупках табліцы ў адпаведнасці з гукавым значэннем літар *е, ё, ю, я*.**

Вецер, вёслы, яблык, без сну, не мог, пад’езд, пад’ём, першае, Юра, б’е, Люда, яма, лёс, ёмкі, юны, прадвесне, лузанец, без памяці, буслянка, ластавяня, надхмар’е, любоў, збуялы, палёт, п’ю, ён, люк, мёд, двух’ярусны, люты, юхт.

| э | jэ | о | jо | у | jу | а | jа |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

**6. Размяркуйце словы і спалучэнні слоў па слупках табліцы ў адпаведнасці з гукавым значэннем літары *і*.**

Над ім, краіна, заінелы, педінстытут, звышімклівы, песня і музыка, брат і сястра, гук і фанема, на Івана, з Ігнатам, у міры, індыкатар, лёд і снег, луг і травы, вясёлы і цікавы, на ігрышчы, у маі, Мінск і Масква, каласавік, міжінстытуцкі, ілгун, салаўі, аб’інець, музыкі іграюць, спортінвентар, мроіва, у іхніх, суперінтэлект, экс-інжынер, дзеці ідуць.

| і | jі | ы | j |
|---|---|---|---|
| | | | |

**7. Размяжуйце пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні галосных. Адказ абгрунтуйце.**

Іграць – падыграць – пайграць, поле -- палі, цэгла -- цагляны, лён -- лянок, пень -- пня, сем -- сёмы, памерці -- паміраць, узняў -- яна ўзняла, узняць -- узнімаць, церці – зацірка – цёр -- тру, ісці -- падысці, племя – племені -- плямён, сухі – высыхаць -- сохнуць, зняць -- зніму, бяру – збіраць – збор -- сабраць, плюю -- пляваць, пачаць – пачну -- пачынаць, тросць -- трысцё, сыночак -- сыночка, ліць -- лой-лью, ветлівы -- вітаць, біць – бой -- б’ю, ідэя -- безыдэйны, ісці -- пайсці, узгорак -- на ўзгорак.

**8. Затранскрыбіруйце тэкст. У першых дзвюх фразах ахарактарызуйце зычныя гукі па тых прыметах, паводле якіх яны ўтвараюць суадносныя пары. Якімі артыкуляцыйнымі прыметамі характарызуецца кожны зычны гук?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Снег... Падае мільгатлівамі, іскрыстымі шматкамі. Усцілае зямлю. Робіць зіму. Зноў зіму, за якой абавязкова прыйдзе вясна – загамоняць ручаі, зацвітуць вішні, зашчабеча птаства...

У жыцці чалавечым не так. Прапусціў сваё шчасце раз, страціў яго аднойчы – можаш болей не дачакацца.

З. Прыгодзіч.

**9. Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім і ахарактарызуйце гукі, аднолькавыя паводле спосабу ўтварэння. Чым вызначаецца спосаб утварэння зычных?**

У парку – лістапад. Дрэвы стаяць маўклівыя, сонныя, з іх не-не ды і злятаюць пажоўклыя лісты: настаў іх час.

Абарвецца ліст, зашамаціць лагодна, мякка, нібы развітваецца з тымі, што застаюцца вісець, і апускаецца павольна, хапаючыся за малюсенькія расінкі туману. А зачэпіць суседа – і ўжо ўдвухападаюць. Бывае, ліст за ліст чапляецца, чапляецца, і на зямлю ўжо сыплецца жоўтая замець. Слухаеш шоргат лісця – і становіцца сумна: шкада лета, цяпла.

Таямніча ў старым парку. Нерухомыя елкі ўткнулі ў неба свае доўгія пікі-верхавіны. Унізе пад іх шырокімі лапамі змрок. На палянцы, дзе стаяць, узяўшыся за рукі, нібы сабраліся весці карагод, каштаны, яшчэ светла.

М. Дзелянкоўскі.

**Да наступных тэрмінаў падбярыце сінонімы: змычныя, змычна-шчылінныя, шчылінныя, дрыжачы, змычна-праходныя.**

**10. Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім цвёрдыя і мяккія зычныя. Назавіце пары па цвёрдасці-мяккасці. Адкажыце, што такое палаталізацыя. Якая артыкуляцыйная прымета характэрна палаталізаваным зычным гукам? Вызначце, колькі разоў у тэксце ўжыты палатальны гук.**

Ветру не было цэлы дзень. Ён, мусіць, недзе заблудзіўся ці, нагуляўшыся ўчора, стомлена заснуў дзе-небудзь у Налібоцкай пушчы. А пад вечар стала яшчэ цішэй. Падалося, што нехта накрыў гарадок цёмным купалам неба ды яшчэ прыціснуў купал да зямлі, каб ніводзін гук не пранік у сярэдзіну яго, не парушыў глыбокага асенняга спакою. Мне здаецца, што такой празрыстай цішыні больш ніколі не надарыцца, і я цешуся гэтай цішынёй.

Шэры туман павіс над зямлёй. Ён такі густы, нібы хто сабраў туманы з усяго свету і пусціў іх сюды. Відаць, як у святле ліхтароў мігцяць мільёны малюсенькіх кропелек. Ідзеш, а яны пераліваюцца, мітусяцца, усё роўна нібы збіраюцца ў вясёлку.

М. Дзелянкоўскі.

**11. Прачытайце верш, затранскрыбіруйце яго. Згрупуйце і ахарактарызуйце зычныя гукі паводле месца ўтварэння. Якія органы маўлення вызначаюць месца ўтварэння зычных гукаў?**

Спакойнага шчасця
не зычу нікому:
Навошта грымотам
маланка без грому,
Навошта ручай
без пякучае смагі,
Халодная ўвага,
не вартая ўвагі,
Жаданні, што прагныя
крылы згарнулі,
Зязюля без лесу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і лес без зязюлі?

А.Куляшоў.

**12. Прачытайце верш, затранскрыбіруйце яго. Ахарактарызуйце гукі паводле звонкасці-глухасці. Назавіце словы, у якіх ёсць санорныя гукі. Па якіх артыкуляцыйных прыметах іх вылучаюць у асобную групу? У чым асаблівасць санорных гукаў?**

**Над спаленай вёскай**

Над спаленай вёскай,
адзетай жалобным гранітам,
Званы абзываюцца
рэхам вайны незабытым.
Хай вечны агонь,
што запалены ў памяць Хатыні,
Як рунь і як неба,
палае – зялёны і сіні,
Няхай яго полымя
жытам спякотным і спелым
Схіляецца ў ногі
Хатыні дварам скамянелым,
Парогу халоднаму,
прызбе маўклівай пры хаце,
Хай гора, заснуўшае ў камні,
прачнецца ў набаце.

А.Куляшоў.

**13. Вызначце, якімі артыкуляцыйнымі характарыстыкамі адрозніваюцца наступныя гукі (па ўдзеле голасу і шуму, спосабе ўтварэння, месцы ўтварэння, цвёрдасці - мяккасці).**
[б – б’], [в - т], [j - г], [п - р], [ф - к], [д - л], [х - ф], [з – з’], [ʐ – б’], [б’ – в’], [ц’ – н’], [ж - р], [т - j], [с – ʐ’], [ʐ’ – л’], [ф’ – к’], [б – б’], [х – ц’], [н - ч], [ж – т ], [з - с], [б’ – п’], [д - л].

**14. У наступных парах слоў назавіце гукі, якія адрозніваюць беларускія і рускія словы. Дайце параўнальную характарыстыку гэтым гукам.**

Не меў – не имел, павук – паук, голуб – голубь, луг – луг, дзве – две, калоссе – колосья, чай – чай, рубель – рубль, без брата – без брата, галава – голова, возера – озеро, герой – герой, суддзя – судья, сям'я – семья, дзе – где, п'еса – пьеса, з’езд – съезд, біялогія – биология, позна – поздно, кроў – кровь, глытаць – глотать, сып – сыпь, снег – снег, траўка – травка, цень – тень, ільгота – льгота, радыёметр – радиометр, ордар – ордер, стагалосы – стоголосый.

**15. Прачытайце верш. Выпішыце з яго спачатку словы, у якіх парныя па звонкасці – глухасці знаходзяцца ў моцнай пазіцыі, а пасля – у слабай.**

Дружа, не будзь да аблудных бязлітасна строгі:
То не віна, а бяда іх; бяду – не карай.
Крыўдна, вядома, што збіліся людзі з дарогі
І не шануюць, як трэба, бацькоўскі свой край,
Хоць гаварылі ячшэ мудрацы-скамарохі:
“Помні: на роднай зямлі – і пад елкаю рай”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Простыя ісціны часам так цяжка даюцца:
Покуль адолееш – слёз ручаіны пральюцца.

Н. Гілевіч.

**16. Ахарактарызуйце пазіцыйныя змены зычных гукаў. Выпішыце з тэксту словы, у якіх назіраюцца пазіцыйныя змены зычных.**

Перад вачамі Міці паўсталі будка, пераезд, сасна, нібы жывы, мільгнуў смутны твар маці і зацяты, суровы – бацькаў. Злавіў сябе на думцы, што гэты год, запоўнены вайной, жывучы ў сям'і, вельмі мала думаў пра родных. Чыя ж была праўда, яго ці бацькава? Бацька папярэджваў, бачыў наперад, што можа здарыцца. Цяпер Міця глядзеў на ўсё, што за гэты год было, як бы з аддаленасці, з якой стала ўсё відней. Бацька меў рацыю па-свойму. Думаў пра сям'ю, жыў яе інтарэсам, і толькі гэтак можна яго зразумець. Ён, Міця, таксама не зрабіў памылкі, як і гэты хлопец, і ягоны брат, што, пакінуўшы адну маці, пайшлі з вінтоўкай без патронаў у лес. Увогуле яны не маглі быць інакшымі. Міцю зноў агарнуў востры жаль да маці, да бацькі, да братоў і сясцёр, якія там, дома. Адчуваў – не трэба даваць волю ўспамінам, якія вядуць услед за сабой расслабленасць, намаганнем волі душыў у сабе смутак. Але мінулае вярталася, стаяла ўваччу.

Паводле І. Навуменкі.

**17. Знайдзіце "чацвёртае лішняе" ў сувязі з паняццем "камбінаторныя змены". Адказ абгрунтуйце.**

1. Гігіена, дыета, Навум, геолаг.
2. Праязны, слаць, хрысціць, жаласлівы.
3. Шавецкі, ткацкі, палескі, чэрвеньскі.
4. Марфаналогія, дзікабраз, трагікамедыя, першапраходцы.

**18. Размяжуйце пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні зычных гукаў. Адказ абгрунтуйце.**

Чатыры – чацвёрты, чытала – чытаў, з радасцю – з жахам, галава – галоўка, купіць – куплю, крыло – крылле, рост – вырашчу, стол – на стале, бяроза – бярозка, сады – саджу, славіць – слаўлю, вязаць – вяжу, свет – свячу, помста – помслівы, лавіць – улоў, рука – зручны, хада – хадзіць, з рамонка – з чабору, бераг – на беразе, мыш – мышшу, пускаць – пушчу, насіць – пераносчык, вітаеш – вітаешся, страх – страшыць, карміць – кармлю, прылада – прыладдзе, восень – асенні, вазы – воз, нага – нажны, муха – мусе, блеск – блішчыць, рабіць – раблю, суды – судзіць, перапісаць – перапісчык, мука – у муцэ, дуб – дубы, спяваць – спеў, пісаць – пішу, страха – стрэхі, графіць – графлю.

**19. Запішыце тэкст у фанетычнай транскрыпцыі. Да выдзеленых слоў падбярыце аднакарэнныя словы ці формы слоў з пазіцыйнымі і гістарычнымі чаргаваннямі зычных гукаў.**

І. Шэры туман **павіс** над зямлёй. Ён такі густы, нібы хто **сабраў** туманы з усяго **свету** і **пусціў** іх сюды. Відаць, як у святле ліхтароў мігцяць мільёны малюсенькіх кропелек. Ідзеш, а яны пераліваюцца, мітусяцца, усё роўна нібы збіраюцца ў вясёлку.

М. Дзелянкоўскі.

ІІ. Я стаю на высокім беразе Нарачы каля вёскі Купы і **гляджу** на бязмежны блакітны прастор, які зліваецца на даляглядзе з небам. З левага боку цямнее невялікі **нізкі востраў**. Пад **нагамі сухая** глеба, пакрытая кустамі ядлоўцу, верасам і чаборам. Крыху далей высокі бераг з сасновым лесам **пераходзіць** у шырокі пясчаны пляж.

В.Вольскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

III. Дзверы **засыпала** зямлёю, і Грынявіцкі **разграбаў** яе – спачатку рыдлёўкай, а потым, дарэшты **змогшыся**, **рукамі**, і апошнія кроплі моцы падтрымлівалі ў ім веданне, што ён не самотны, што недзе побач прабіваюцца да святла іншыя.

У.Арлоў.

**20. Выпішыце з тэксту словы з фанетычным падаўжэннем і марфалагічным падваеннем. Растлумачце, як узнікла фанетычнае падаўжэнне і марфалагічнае падваенне. Якія зычныя падаўжаюцца ў беларускай мове і ў якой пазіцыі?**

I. Князёўна з маленства чула паданні пра дзеда, пра Рагнеду-Гарыславу, што так і не змагла скарыцца Уладзіміру Краснаму Сонейку, пра іншых славутых продкаў, чыё жыццё прайшло пад знакам адданасці Полацку. Падручнікамі служылі Святое Пісанне, жыціі святых… . Прыйдзе час, і сама князёўна зробіцца гераіняю жыццеапісання зямнога шляху і духоўных подзвігаў святога.

У. Арлоў.

II. Да дошкі, прыбітай да апошняга вянца зруба і мокрай ад вады, паналіпалі белыя парашуцікі з цёмна-карычневымі крапінкамі зярнятак – цяпер самае вялікае рассяленне розных дзікіх траў: насенне павыспявала і зараз спяшаецца як мага далей адляцець, там прызямліцца, зачапіцца за што-небудзь, а потым прарасці, пачынаючы на новым месцы сваю, новую калонію асоту, дзядоўніку, малачаю.

Я.Сіпакоў.

III. Ад карміліцы, нянек, маці князёўна чула абрадавыя песні, замовы і заклёны. У той жа час хрысціянска-паганскае дваяверства існавала на Полаччыне нават у княжым асяроддзі, значыцца, Прадслава добра ведала даўнейшых багоў. Яе юныя гады немагчыма ўявіць без гуканняў вясны, русалляў, купалляў і калядаў.

Дзяцінства тады было карацейшае, чым сёння. Мінулася княжай дачцэ дванаццаць гадоў – трэба збірацца замуж. Пагатоў, слава аб Прадславінай прыгажосці і розуме разнеслася “па ўсіх гарадах”, і ў Полацк зачасцілі сваты.

У.Арлоў.

**21. Затранскрыбіруйце словы, групуючы іх у адпаведнасці з тымі фанетычнымі працэсамі, у выніку якіх яны набылі такое гучанне.**

Завушніцы, арыентацыя, журавель, што, амшара, дыягназ, ад поля, к дому, з вёскі, лічба, збіраешся, дождж, пацвердзіць, расчыніць, бастыён, ілгун, сыроватка, вустрыца, дзёран, доўг, уваччу, класці, наскі, па-інтэлігенцку, кампосны, гэтаксама, кантрасны, таварыскі, насенне, убоства, хто, унук, з поля, экзэмпляр, футболка, з жаху, госці, пераезд, Дзмітрый, дыяфрагма, счапіць, далонь, ніводзін, рубель, талерка, весці, вакзал, адпачыць, грузчык, дзве, разжаліць, кроў, стагоддзе, замуства, па-дзявоцку, палескі, трэснуць, міласэрнасць, адгэтуль, помслівы, гарадскі, мноства, узвышша, развітваешся, так было, рэдка, згіб, бясшкодны, скарасны, бабёр, вусцішна, навобмацак, аржанішча, ірдзенне.

**22. Спішыце словы, падкрэсліце ў іх літары, якімі абазначаны звонкія зычныя гукі, адной рыскай, глухія – дзвюма.**

Барацьбіт, дзядзька, магчыма, анекдот, Віцебск, рукзак, падсохнуць, ледзь, з песняй, мігценне, малацьба, стрыгчы, плашч, луг, парог, носьбіт, бейсбол, дужка, моладзь, абступіць, згінуць, завадзь, зведаць, падсабіць.

**23. Спішыце словы, падкрэсліце ў іх літары, якімі абазначаны цвёрдыя зычныя гукі, адной рыскай, мяккія – дзвюма.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У таварыстве, пацвільвацца, зняць, адвезці, Ядвіга, з'яўленне, скінуць, згінуць, распісаць, падлячыць, сфера, пенсія, клятва, з верасня, мазгі, пад вечар, дзвесце, цвінтар, з'ехаць, мундзір, схіліць, падзелены, сцябло, хлеб, транзіт, у адозве.

**24. Спішыце словы, падкрэсліце ў іх літары, якімі абазначаны шыпячыя зычныя гукі, адной рыскай, свісцячыя – дзвюма.**

Зжаць, па кладачцы, на дошцы, у бочцы, на кветцы, лётчык, не парэжся, расшчапіць, адчуванне, нашчадак, з чаго, зжаваць, пераможца, грузчык, пясчаны, з жыцця, дакладчык, усчынаць, расшчодрыцца, прышчапіць, выязджаць, у дзежцы, адважся, на рэчцы, расчоска, у вопратцы.

**25. Затранскрыбіруйце пары слоў і адкажыце, якімі гукамі яны адрозніваюцца. Якія пары слоў адрозніваюцца толькі на пісьме?**

Яна – мая, лётчык – агародчык, мець – медзь, роўнядзь – раўняць, у лодцы – у бочцы, каска – казка, сняжок – беражок, грып – грыб, радон – раён, адбыць – адбіць, узвесці – узысці, салодкі – дрыготкі, мяккі – лёгкі, рашчыніць – расчыніць, дужка – падушка.

**26. Выпішыце з тэксту і затранскрыбіруйце словы (спалучэнні слоў), у якіх назіраецца асіміляцыя зычных па звонкасці – глухасці. Якія зычныя і пры якіх умовах падвяргаюцца асіміляцыі па голасе?**

Ніколі ў жыцці ёй [Фрузыне] не было так хораша і па-маладому весела. Пархомаў добра еў, аж пачырванеў з твару ад з'едзенага і з нейкай лёгкай сяброўскай шчырасцю абыходзіўся з ёю. Ён нешта гаварыў і гаварыў з Фрузынай, але яна як бы не ўнікала ў сэнс яго слоў. Яна ўся аддалася ва ўладу сваіх пачуццяў – ціхага шчасця ад прывабнай цеплыні блізкай чалавечай душы.

Пархомаў адсунуў ад сябе талеркі, адчыніў партабак. Яна, поўная замілавання да гэтага чалавека, усё пазірала на яго памаладзелы гладкі твар, які заставаўся па-ранейшаму спакойны і разважны. Пархомаў падсунуў лаўку бліжэй да яе табурэткі і раптам проста, упэўнена, але зусім не груба, з пяшчотай прыгарнуў яе да сябе.

В.Быкаў.

**27. Выпішыце з тэксту і затранскрыбіруйце словы (спалучэнні слоў), у якіх назіраецца асіміляцыя зычных гукаў па мяккасці. Якія зычныя і пры якіх умовах падвяргаюцца асіміляцыі па мяккасці? Назавіце словы, у якіх асіміляцыі зычных па мяккасці не адбылося. Чаму?**

Яму б толькі дажыць да світання. Тым часам мароз дабіраўся ўжо да яго нутра, і лейтэнант адчуваў гэта. Краем прыцьмелай свядомасці ён сачыў за тым, як сцюжа марудна, але няўхільна схілілася над яго абяскроўленым целам, і лічыў кароткія хвіліны, якія яму яшчэ засталіся. Аднойчы, расплюшчыўшы вочы, ён раптам здзівіўся і з натугай скіраваў позірк на поле. Світала. Цемра, якая, здавалася, век шчыльным покрывам аблягала зямлю, трохі прыўзнялася над ёй, у полі стала прастарней, праяснелася неба, і ў ім выразна адбілася заінелае вяршалле бяроз. У прытуманеную ранкам далячынь імкнула перамеценая завеяй дарога.

Ухапіўшы ўсё гэта адным позіркам, які тым не менш амаль знясіліў яго, лейтэнант хацеў адвесці вочы, як раптам штосьці ўбачыў. Здалося спярша, што гэта машына, але калі ён лепей угледзеўся, дык зразумеў, што гэта фурманка. Стомлены працяглай увагай, ён палажыў галаву на снег, адчуваючы ў сабе збянтэжанасць, страх і надзею адначасна.

В.Быкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**28. Затранскрыбіруйце тэкст, падкрэсліце словы (спалучэнні слоў), у якіх ёсць асіміляцыя і аглушэнне звонкіх зычных у канцы слова. Ахарактарызуйце асіміляцыю і аглушэнне.**

Мароз пакуль невялікі – трохі ніжэй за нуль, але снег, што выпаў учора ноччу, ляжыць. Стала бела навокал, святочна.

І ўсё ж зіма ў горадзе – не тое што ў вёсцы. Памятаю, як з’яўлялася зіма ў гады майго маленства. Прачынаешся ранічкаю, расплюшчваеш вочы – а ў хаце непрывычна светла, неяк свежапрахалодна. І ў той жа момант прыходзіць здагадка: на дварэ – снег!

Кумільгом ускокваеш з ложка і – да акна. Уга! Бялюткая пярына ўслала зямлю, дрэвы ў ваце. Ахоплівае нецярплівая радасць. Хутчэй апранаешся, шукаеш боты, устаўляеш у іх халоднае нутро босыя ногі, шапку на вушы – і на двор. Прабегчы па чыстым, рыпучым снезе, пакідацца першымі снежкамі…

У горадзе нават для дзяцей зіма пачынаецца неяк непрыкметна, будзённа. Выйдзеш раніцаю на вуліцу, а першы снег ужо ўезджаны машынамі…

З. Прыгодзіч.

**29. Прачытайце тэкст. Адзначце фанетычныя асаблівасці беларускай мовы.**

Крочу па зялёным мяккім моху далей. Які цудоўны дыван разаслала тут прырода! Колькі прыгоства і харaства! Бярозы расступаюцца, быццам хочуць даць камусьці месца. На невялікай палянцы стаіць магутны дуб. Ён узнёс сваю вершаліну высока ў неба, і ва ўсёй яго постаці столькі важнасці, гонару, што бярозы нават баяцца падысці да яго блізка. Яны тоўпяцца навокал, такія стройныя, беланогія, як тыя дзяўчаты ў карагодзе.

Раптам у лесе штосьці загуло. Я зірнуў угору, вершаліна дуба злёгку варухнулася. Там, уверсе, налятаў бязлітасны вецер. І дуб, прыняўшы яго на сябе, як бы папярэджваў сваіх суседак-бярозак: будзьце напагатове, бярэцца вецер, я прыкрываю вас як магу, але ж і вы трымайцеся. І ў тую ж хвіліну бліснула, дробна задрыжала лісце на бярозках. Быццам дзякавалі яму, дубу, за перасцярогу, за клопат пра іх.

Я доўга ўспамінаю гэтую сустрэчу з бярозавым гаем, у вушах маіх стаяла яго трывожная песня. Я бачыў перад сабой зграбныя пяшчотныя бярозкі, чуў іх прыглушаны шэпт. А над бярозамі, быццам закрываючы іх ад ветру, стаяў асілак-дуб. І мне падумалася: жыццё лесу шмат з чым падобнае на жыццё людзей.

М. Шыманскі.

**30. Выпішыце пары слоў, у якіх націск з’яўляецца сродкам адрознення лексічнага значэння. Раскрыйце функцыю націску з дапамогай астатніх пар слоў.**

Старшы́ні – старшыні́, заўважа́ць – заўва́жаць, раса́ – ра́са, хі́ба – хіба́, ру́кі – рукі́, ва́зы – вазы́, дазна́юся – дазнаю́ся, па́сты – пасты́, ка́са – каса́, наклі́каць – накліка́ць, га́дзіць – гадзі́ць, куліна́рыя – кулінары́я, пля́скаць – пляска́ць, ра́іць – раі́ць, тра́вы – травы́, склі́каць – скліка́ць, а́тлас – атла́с, ба́біна – бабі́на, су́ддзі – суддзі́, выкліка́ць – вы́клікаць, галі́на – галіна́, зі́мы – зімы́, на́сып – насы́п, ду́гі – дугі́, разві́ты – развіты́, спыні́ць – спы́ніць, кара́лі – каралі́.

**Якія фанетычныя адзінкі адносяцца да суперсегментных? Назавіце тыпы націску ў беларускай мове. Ахарактарызуйце беларускі слоўны націск.**

**31. Спішыце словы, пастаўце ў іх асноўны (акут) і, дзе трэба, пабочны (гравіс) націск. Якія словы маюць два націскі?**

Корманарыхтоўка, дэзынфармацыя, вогнетрывалы, пяцідзёнка, міжінстытуцкі, шасцісоты, збожжасховішча, папаварочваць, азотнакіслы, работадавец, торфаўборачны, лёдадрабілка, дэкваліфікацыя, мёдаварэнне, паперакідаць, легкадумна, крывятворны, вялікадзяржаўны, велікасвецкі, арэхападобны, ніжэйадзначаны, Вялікабрытанія, антываенны, жыццеапісанне, матаразборка, шэсцьсот, шасціствольны, белабрысы, свежавымыты, велікадушны, дабрадзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**32. Перакладзіце словы на беларускую мову і пастаўце ў іх націск. Адзначце разыходжанні ў акцэнтуацыі ў беларускіх і рускіх словах.**

Окунь, журавль, гражданин, некоторые, занятость, звонят, имя, ножницы, ольха, кухонный, доверху, на землю, намертво, названный, леденец, ненависть, талант, поровну, товарищество, фартук, стеклянный, нести, ремень, обломанный, самого, что-нибудь, кроить, порванный, именное (склонение), лопух, товарищеский, четырнадцать, одинадцать, четверо, ноготки, тихонечко, отвезти, письменность, верба, настланный, натрясти.

**Заданні для самастойнай працы**

**1. Расшыфруйце словы па ахарактарызаваных гуках.**

Варыянт 1

Слова складаецца з пяці гукаў:
1) зычны – шумны, глухі, заднеязычны, змычны, цвёрды;
2) галосны – сярэдняга рада, ніжняга пад’ёму, нелабіялізаваны;
3) зычны – шумны, глухі, губна-губны, змычны, мяккі;
4) галосны – пярэдняга рада, сярэдняга пад’ёму, нелабіялізаваны, націскны;
5) зычны – шумны, глухі, пярэднеязычны, шчылінны, шыпячы, зацвярдзелы.

Слова складаецца з чатырох гукаў:
1) зычны – шумны, глухі, губна-губны, змычны, цвёрды;
2) галосны – задняга рада, сярэдняга пад’ёму, лабіялізаваны, націскны;
3) зычны – санорны, змычна-праходны, бакавы, пярэднеязычны, мяккі;
4) галосны – пярэдняга рада, сярэдняга пад’ёму, нелабіялізаваны.

Варыянт 2

Слова складаецца з чатырох гукаў:
1) зычны – шумны, звонкі, пярэднеязычны, шчылінны, цвёрды, свісцячы;
2) зычны – санорны, змычна-праходны, насавы, пярэднеязычны, цвёрды;
3) галосны – задняга рада, сярэдняга пад’ёму, лабіялізаваны, націскны;
4) зычны – санорны, губна-губны, шчылінны, няпарны цвёрды.

Слова складаецца з чатырох гукаў:
1) зычны – санорны, пярэднеязычны, дрыжачы (вібрант), зацвярдзелы;
2) галосны – сярэдняга рада, ніжняга пад’ёму, нелабіялізаваны;
3) зычны – шумны, глухі, заднеязычны, змычны, цвёрды;
4) галосны – сярэдняга рада, ніжняга пад’ёму, нелабіялізаваны.

**2. Выпішыце словы, у якіх ёсць наступныя гукі: [з’], [г], [с], [х], [ш], [т], [д].**

Варыянт 1

Мыешся, адчапіць, скінуць, сэрвіс, шніцаль, магчы, айсбергі, мазгі, жаласлівы, вучышся, адчапіць, прыезд, з поля, як бы, экзамен, ад чоўна, раскідаць, счапіць, усчаць, наладчык, рэкрутчына, на сцежцы, з бегу, без’языкі, ссівелы, футболка, звышімклівы.

Вараянт 2

Спевы, вораг, схіліць, як было, звінець, пераезд, снег, з неба, рубеж, шчасце, экзэмпляр, дождж, стог, ганак, аднесці, ад чаго, бачышся, адчыніць, хітрыць, ад сябра, дзве, слёзы, рэзчык, на дошцы, футбол, бухгалтер, світар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Затранскрыбіруйце тэкст, падзяляючы словы на склады. Адкажыце, якімі правіламі складападзелу карысталіся пры гэтым. Дайце характарыстыку кожнаму складу (адкрыты, закрыты; непрыкрыты, прыкрыты).**

Варыянт 1

**Мова**

Бывае,
спатрэбіцца ўзімку
Промень, не злоўлены летам,
Бывае,
што мала пахаў
У моры травінак і красак,
Бывае,
не хопіць колераў
У вясновым квяцістым разліве,
Бывае,
так мала гукаў
Чуецца ў моры лесу,
Бывае,
не радуюць песні
Мора крылатага птушак –
Тады я іду да цябе,
Мой акіян вялікі,
У які ўсе моры ўпадаюць, –
Мая адзіная мова!

Я. Сіпакоў.

**Выканайце фанетычны разбор слоў *акіян, не хопіць***

Варыян 2

За мару сяўбы
І за хмару журбы
Я ўдзячны Радзіме і ў момант любы
Быць лёгкім хачу на паміне –
Гатовы ў падпасках хадзіць я, абы
Не пасынкам быць на чужыне!
Сцяжынай ласкавай у палыне,
Нясмелай зоркай у тумане,
У веснім цудзе,
Ў касмічным гудзе
Радзіма будзе
Жыць без мяне,
Мяне без Радзімы не будзе!

Р.Барадулін.

**Выканайце фанетычны разбор слоў *у падпасках, будзе.***

**4. Спішыце словы, пастаўце ў іх націск. Пры неабходнасці звяртайцеся да слоўнікаў.**

Варыянт 1

Садавіна, алфавіт, блукаць, цэмент, існуе, вусы, грамадзянін, выпадак, каменны, дакумент, заінець, заечы, прыняты, дыспансер, дыямент, даўніна, крапіва, вязанка, індустрыя, жыхар, квартал, загрудкі, слабы, крыху, апрануты, кулінарыя, інструмент,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

камбайнер, цяжар, мысленне, карабель, магазін, маляр, статуя, статут, сталяр, бульбяны, латаць, сінанімія, жывіца.

Варыянт 2

Чатырнаццаць, касцяны, нудлівы, навіна, здаўна, мышленне, запечак, ільняны, грамадзянін, жалюзі, успрыняты, арахіс, рукавы, імя, ваганне, вудзіць, гнісці, туманы, алкаголь, медыкаменты, рабрына, наспех, пасланец, генезіс, ласкавы, цэмент, прэміраванне, аксюмаран, факсіміле, фартух, вулей, каўчук, прыступка, прадзед, хрысціянін, забрудзіцца, гусценькі, адзінаццаць, дасыта, аркуш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ